касцёлах, на могілках, пераважна ноччу, у неспрыяльнае надвор’е, прысутнічаюць тагасветныя істоты, чытач запалоханы прадчуваннем блізкай трагедыі. Гатычны раман “Скокі смерці” – цікавая мастацкая знаходка пісьменніцы, “твор, які сінтэзуе элементы гатычнага, прыгодніцка-дэтэктыўнага, філасофскага раманаў, у якім удала злучаны нацыянальна-гістарычныя (этнанацыянальная самаідэнтыфікацыя беларусаў, захаванне гістарычнай памяці) і так званыя вечныя праблемы (пачуццё і доўг, вернасць)” [1, с. 150].

Такім чынам, адметнасцю гатычнага жанру з’яўляюцца вусцішныя краявіды, разбураныя старажытныя замкі, напоўненыя прывідамі і зданямі, таямнічыя сутарэнні, бандыты і харызматычныя злодзеі, гіпербалізацыя прадчування жахлівых нечаканых падзей і жудасныя вобразы фізічнай дэградацыі і энтрапіі як наступстваў родавага праклёну ці страшнай сямейнай таямніцы.

## Літаратура


1. Бароўка, В. Ю. Раманы Людмілы Рублеўскай як мастацкі дыялог з жанравай традыцыяй / В. Ю. Бароўка // Białorutenistyka Białostocka. – Т. 7. – Białostock. – 2015. – С. 147–160.
2. Лаўкрафт, Г. Сверхъестественный ужас в литературе [Электронный ресурс] // Г. Лавкрафт. – Режим доступа: http://lib.ru/INOFANT/LAWKRAFT/sverhestestvennyj_uzhas_v_literature.txt. – Дата доступа: 23.03.2019.
3. Watt, I. The Rise of the Novel [Electronic resource] // I. Watt. – Mode of access: http://www.uni-koeln.de/phil-fak/englisch/lehre/downloads/ essaythemen_ma.htm. – Date of access: 23.03.2019.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Асоба мастака праз светаадчуванне В. Карамазава


*А. К. Пекач, К. А. Дзеравянка, Д. А. Ільянкова*

*Ліцэй № 2 (Мінск)*



**Анатацыя.** У артыкуле вызначаецца сутнасць паняццяў “аповесць-эсэ”, “мастацкі вобраз”, “эскіз”, “эцюд”, “споведзь”, “рэтраспекцыя”, раскрываецца ідэйна-эстэтычная значнасць выяўлення творчай асобы В. Бялыніцкага-Бірулі ў аповесці-эсэ В. Карамазава “Крыж на зямлі і поўня ў небе”, выяўляюцца сродкі раскрыцця творчай асобы мастака.



**Ключавыя словы:** аповесць-эсэ; творчая асоба мастака; ідэйна-эстэтычная значнасць; слоўнае апісанне.

Віктар Філімонавіч Карамазаў – беларускі пісьменнік-празаік, эсэіст, сцэнарыст, журналіст. Ён з’яўляецца асобай творчай, бо арыентаваны на творчасць у розных сферах жыцця і дзейнасці, валодае пачуццём навізны, чуйны да супярэчнасцей, здольны сумнявацца, востра адчувае прагу пазнання, адкрыцця, вынаходніцтва.

Як казаў сам В. Карамазаў у адным з інтэрв’ю, “аналагаў у нашай літаратуры не было. Ніводзін пісьменнік не напісаў пра мастакоў – хоць бы навелу, не кажучы пра аповесць ці раман!” [1] Першым з мастакоў, кім зацікавіўся В. Карамазаў, быў В. Бялыніцкі-Біруля. Былы рэдактар часопіса “Нёман” А. Кудравец прапанаваў В. Карамазаву напісаць эсэ пра пейзажыста. І пісьменнік узгадвае: “Я пайшоў у архіў і знайшоў цікавыя старонкі пісьменніка Войніча, які пасля вайны збіраўся пісаць кнігу пра мастака, меў яго рукапісы. Там былі ўспаміны Бірулі пра дзяцінства. Гэтыя яго старонкі паказалі мне шлях да Бялыніцкага-Бірулі. Тады я знайшоў вёсачку Крынкі на беразе Друці, знайшоў падмурак дома бацькі, бэз пад акном. Потым паехаў на Віцебшчыну, на возера Няшчэрда, дзе калісьці жылі бацькі Бірулі, перагледзеў работы мастака ў Нацыянальным і ў Магілёўскім музеях, захапіўся яго жыццём, і яно вывела мяне да аповесці “Крыж на зямлі і поўня ў небе”. Бялыніцкі жыў у прыродзе, быў выдатным паляўнічым, і для мяне ён аказаўся не толькі творцам, а блізкім па душы і маіх думках лясным чалавекам” [1].

“Крыж на зямлі і поўня ў небе” – адна з васьмі кніг В. Карамазава пра мастакоў, дзе ён распавядае пра жыццёвы і творчы шлях В. Бялыніцкага-Бірулі. Гэты твор напісаны ў жанры аповесці-эсэ і ўключае ў сябе эскізы, эцюды, споведзь. “Стылю эсэ ўласцівы вобразнасць, афарыстычнасць, суб’ектыўнасць, індывідуальная інтанацыя аўтара, яго імкненне да самавыяўлення, самааналізу” [6, с. 134]. Пачынальнікам беларускай эсэістыкі лічыцца М. Стральцоў: яго “Загадка Багдановіча” распачынае гэтую традыцыю. Эскіз – “накід, план літаратурнага ці музычнага твора” [4, т. 5, кн. 2, с. 475]. Споведзь – гэта “шчыры расказ пра ўласнае жыццё; прызнанне ў чым-небудзь” [4, т. 5, кн. 1, с. 269]. Акрамя таго, на працягу ўсяго твора пісьменнік выкарыстоўваў такі мастацкі прыём, як рэтраспекцыя. Рэтраспекцыя – “зварот да мінулага” [4, т. 4, с. 762]. “Крыж на зямлі і поўня ў небе” – аповед пра тое, як убачыць, злавіць дзіўнае імгненне, якое больш ніколі не паўторыцца, як напоўніць яго дыханнем, колерам, музыкай, як даць гэтаму імгненню жыццё на стагоддзі, як зачараваць чытача гэтым імгненнем.

В. Карамазаў шукае фактуру, адметнасць тэхнікі мастака, своеасаблівасць яго жыццёвага шляху, каб найдакладней раскрыць характар галоўнага героя, яго перажыванні і пачуцці. Ва ўсіх творах пісьменніка мастакі паўстаюць як сапраўдныя творцы, якія імкнуцца глыбока адлюстраваць таямніцу сваёй душы, прыроды, таго святла, якім шчодра надзяліў іх лёс. Праз творы В. Карамазава раскрываецца і асоба

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

самога пісьменніка, яго маральныя і творчыя пошукі. Зразумелыя словы даследчыка літаратуры Ц. Чарнякевіча: “Выбар мастакоў Карамазавым незвычайны: усе карціны іх вельмі сугучныя яму самому, ягонай прозе: тонкае і строгае, атмасфернае, аж да слязы ўваччу, пісьмо Бялыніцкага-Бірулі, святочная сонечнасць Антона Бархаткова, пышнасць і яркасць інтэр’ераў Станіслава Жукоўскага, метафізічнасць Вашчанкі. Кнігі Карамазава – нават больш, чым біяграфіі, гэта своесаблівае сумоўе з мастакамі, нейкі фрагмент неперарванага дыялогу з імі, разгадванне іх карцін, іх лёсу і самой Беларусі, якая на гэтых карцінах нярэдка ўзнікала. Можа, для біяграфістыкі – гэта таксама крыху эксперыментальна, але ў гэтым дыялогу, у незавершанасці яго – увесь смак карамазаўскіх кніг” [5]. Унутраны свет мастака няпросты, схаваны, увесь у карціне, і, каб яго, гэты свет, зразумець і перадаць словам, трэба таксама быць мастаком ад Бога. Ды і не толькі зразумець, а знайсці магчымасці і сілы адшукаць і тое, што дагэтуль было пра мастака невядома.

Ідэя асобы ў сучаснай сусветнай літаратуры адносіцца да ліку найбольш актуальных праблем, якія датычацца адносін свету і чалавека. У апошнія дзесяцігоддзі пісьменнікі, якія працуюць у жанры прозы, пачалі праяўляць вялікую цікавасць не толькі да вырашальных момантаў свайго гістарычнага мінулага, але і да значных гістарычных фігур, якія ўздзейнічалі на лёс свайго народа. Менавіта ў аповесці-эсэ “Крыж на зямлі і поўня ў небе” В. Карамазава шматгранная асоба беларускага мастака раскрываецца з усіх магчымых бакоў.

У аповесці святло – гэта не толькі неабходная передумова творчасці, але і яе ўнутраная сутнасць: улада колераў і святла, у іх – таямніца жыцця і свету: “*Дзе святло – там і цені. Вечная паміж імі гульня*” [3, с. 171]. Усе разгорнутыя пейзажы ў аповесці ўтрымліваюць светлавыя характарыстыкі, і ад якасці асвятлення залежаць адценні, нюансы колераў. Урэшце, святло ў прыродзе будзіць святло ў душы мастака. Герой аповесці-эсэ не толькі шукае колеравае сугучча карціны, а ў момант натхнення яму чуецца адметны гук: “*Я злавіў гукі аргана… То была знаёмая меса <…>, ад якой заўсёды замірала ў замілаванні сэрца… Я пачуў месу Грыга*” [3, с. 62–63]. Сэнс жыцця мастака – у яднанні з прыродай. “*Колькі суму па роднай Беларусі, па яе лясах, балотах, ранішняй смузе, прырэчных туманах, па нізкіх у небе воблаках з іх светла-шэрымі, блакітнаватымі, жаўтлявымі танамі…*” [3, с. 172] Светла-шэрую, срабрыста-блакітную, жамчужна-перламутравую гаму В. Бялыніцкага-Бірулі, што ўласціва беларускай прыродзе, шмат хто тлумачыў нацыянальнымі асаблівасцямі таленту, але “*большая праўда ў тым, што душа з маленства была сугучная з душой прыроды і, пішучы яе, родную, ён спавядаў лірычную душу*” [3, с. 172]. А яшчэ сугучнасць і глыбіня мастака ад настаўнікаў, і ў першую чаргу ад яго куміра Ісака Ільіча Левітана: “*Імя Левітана я вымаўляў шэптам…*” [3, с. 94] В. Бялыніцкі-Біруля спрабуе разгадаць таямніцу настаўніка, якая выпраменьвае

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

боль, пакуты, адчуванне разладу, страты, самоту, ранімую душу. В. Бялыніцкі-Біруля разумее, што ўвесь боль Левітана – гэта боль развітання з жыццём, з зямлёй, вадой, небам. Левітан пісаў развітваючыся, а ён, Біруля, пісаў – “*як уваходзіў у жыццё, усе гады да самай глыбокай старасці пісаў кожную карціну як карціну сваёй першай сустрэчы з жыццём*” [3, с. 243].

Спавядальныя інтанацыі ў аповесці-эсэ “Крыж на зямлі і поўня ў небе” надаюць твору суб’ектыўны пачатак. І пісьменнік, і сам герой адкрытыя з намі, упускаюць нас ў самыя патаемныя глыбіні свайго ўнутранага свету. Кранальныя спавядальныя словы В. Бялыніцкага-Бірулі пра адчуванне шчасця на роднай зямлі і пра шчымлівы боль немагчымасці вярнуцца пазней на радзіму: “*Я хадзіў па роднай зямлі, я быў шчаслівы. Але гады мяне скоўваюць. Іначай пабываў бы на Палессі, у Краснаполлі, каля мятэчка Чавусы на Магілёўшчыне*” [2, с. 170]. У лістах Бялыніцкі-Біруля ўважліва назірае, павучае, нават заклікае, спавядаецца, спадзяецца, шчыра разважае: “*Трэба жыць, жадаць, упарта імкнуцца да мэты, і не жыццё вас пераможа, а вы пераможаце жыццё!*” [3, с. 249]. Слоўнае апісанне мастакоўскіх твораў, безумоўна, створана аўтарскай фантазіяй. Разам з тым яно сведчыць пра стан мастака, пра яго памкненні і трывогі. Карціны, створаныя пісьменнікам, з’яўляюцца сродкам пазнання рэчаіснасці, яны нясуць розную інфармацыю пра людзей і свет, якую ў твор укладае сам аўтар. Апісанні карцін дазваляюць пісьменніку і герою выказаць свае погляды не толькі на пэўны факт, але і на мастацтва ўвогуле. Са старонак аповесці В. Бялыніцкі-Біруля паўстае перад намі як мастак-філосаф, мастак-патрыёт, мастак-прафесіянал, мастак-пейзажыст: “*Вось яны – улада колераў і ўлада святла. У колерах і святле – таямніца жыцця, свету?*” [3, с. 66]; як паляўнічы: “*Жывапіс і паляванне. Адно і другое – жыццё ў прыродзе*” [3, с. 74]; як клапатлівы бацька: “*Усё самае светлае, чыстае, лепшае Вітольд Каятанавіч аддаваў Любашы*” [2, с. 95]; як удзячны вучань, сябар, шчыры чалавек: “*Прырода навучыла дабраце. Ён бачыў у чалавеку добрае, па добрым вызначаў цану чалавека, сваю да яго цікавасць*” [3, с. 172].

Творчыя пошукі пісьменніка бачацца нам вельмі незвычайнымі і запамінальнымі, бо толькі В. Карамазаў, адзіны ў беларускай літаратуры, адважыўся распачаць мастакоўскую тэматыку. І яму гэта ўдалося: сёння ён нагадвае беларусам і ўсяму свету пра нашых таленавітых мастакоў: Вітольда Бялыніцкага-Бірулю, Антона Бархаткова, Станіслава Жукоўскага, Гаўрылу Вашчанку, Анатоля Бараноўскага, Фердынанда Рушчыца, Антона Вырву, Міколу і Марыю Ісаёнкаў. Напісанае В. Карамазавым пра мастакоў і дакументальнае, і мастацкае адначасова. Пісьменнік абапіраецца і на дакументальныя матэрыялы, і на ўспаміны сучаснікаў, робіць свае творчыя адкрыцці, фантазіруе, каб атрымаўся мастацкі тэкст. У аповесці-эсэ “Крыж на зямлі і поўня ў небе” В. Карамазаў раскрывае

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

непаўторнасць стылю В. Бялыніцкага-Бірулі, яго стрыманую каларыстычную гаму, паказвае тонкасці ўспрымання прыроды, сцвярджае, што ў карцінах мастака ёсць святло і музыка – у гэтым выбітнасць і высокадухоўнасць палотнаў нашага земляка.

Пісьменнік знаёміць нас не толькі з асобай мастака, але і з менталітэтам беларускага народа, дапамагае зразумець асаблівасці беларускай самасвядомасці, вызначае духоўныя арыенціры яе лепшых прадстаўнікоў і дазваляе нам услед за вялікім мастаком напаўняць сваё жыццё колерам і святлом, гукам і музыкай – у гэтым ідэйна-эстэтычная значнасць выяўлення творчай асобы В. Бялыніцкага-Бірулі ў аповесці-эсэ В. Карамазава “Крыж на зямлі і поўня ў небе”.

Пісьменнік карыстаецца шматлікімі мастацкімі сродкамі, каб больш глыбока і дасканала раскрыць асобу мастака. Такімі сродкамі з’яўляюцца споведзь, праз якую глыбока пазнаецца ўнутраны стан жывапісца, яго пачуцці, уласныя думкі; рэтраспекцыя, якая вяртае ў мінулае ці дазваляе прадбачыць будучыню; выкарыстанне ўласных лістоў мастака, якія даюць самую разнастайную, такую важную для раскрыцця асобы інфармацыю; слоўнае апісанне. Духоўны подзвіг творчай асобы мастака В. Бялыніцкага-Бірулі прадвызначыў духоўны подзвіг творчай асобы пісьменніка В. Карамазава. І створаныя мастаком і пісьменнікам шэдэўры сталі нашым нацыянальным гонарам.

## Літаратура


1. Дзвінская, Э. Віктар Карамазаў: “Імкнуся паказаць, як выяўляецца творчая асоба” : інтэрв’ю [Электронны рэсурс] / Э. Дзвінская // Новы час. – Рэжым доступу: https://novychas.by/kultura/viktar-karamazau-imknusja-pakazac-jak-vyjauljae. – Дата доступу: 20.08.2018.
2. Карамазаў, В. Крыж на зямлі і поўня ў небе / В. Карамазаў. – Мінск : Беларус. Энцыкл., 2010. – 216 с.
3. Карамазаў, В. Крыж на зямлі і поўня ў небе / В. Карамазаў // З вясною ў адным вагоне : аповесці, эсэ, дзённік / В. Карамазаў. – Мінск, 2002. – С. 61–260.
4. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы : у 5 т. / АН БССР. Ін-т мовазнаўства імя Якуба Коласа ; пад агул. рэд. акад. К. К. Атраховіча. – Мінск : БелСЭ, 1977–1982.
5. Чарнякевіч, Ц. З кагорты шасцідзясятнікаў [Электронны рэсурс] / Ц. Чарнякевіч // Pawet. – № 28 (1179). – Рэжым доступу: http://pawet.net/ns/2014/28/%E2%-84%96_28_(1179).html. – Дата доступу: 18.08.2018.
6. Ялынцава, І. У. Слоўнік літаратуразнаўчых тэрмінаў для школьнікаў / І. У. Ялынцава. – Мінск : Беларус. асац. “Конкурс”, 2012. – 144 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ